# Пра жахлівыя выпрабаванні

**Выдавецтва «Деловая печать» выпусціла новую кнігу Зіновія Прыгодзіча. Пад адной вокладкай — нарысы і інтэрв'ю. Аснову кнігі складаюць тэксты, якія расказваюць пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Чытаем у выдавецкай анатацыі: «Кніга «Трывожная памяць» апавядае пра людзей, якія прайшлі праз жахлівыя выпрабаванні Вялікай Айчыннай вайны. Адны — у партызанах і на фронце, другія — дзецьмі — падчас фашысцкай акупацыі. Перажытае налажыла глыбокі адбітак на іх душэўны і духоўны свет, на іх далейшы лёс».**




Як жывы паўстае перад чытачом у расповедзе Зіновія Прыгодзіча народны пісьменнік Беларусі Васіль Быкаў («Вайна — не займальная прагулка»). «З любоўю і нянавісцю зямною» — дыялог з вялікім паэтам сучаснасці і сябрам Генадзем Бураўкіным. Вось што, у прыватнасці, паэт сказаў свайму суразмоўцу: «...Чаму я так многа ўспамінаю пра тыя цяжкія і незабыўныя гады? Таму што думаю: менавіта тады пачала фарміравацца любоў і нянавісць мае і многіх маіх равеснікаў».

У кнізе Зіновія Прыгодзіча чытача чакаюць сустрэчы з народным мастаком СССР Міхаілам Савіцкім, празаікам Барысам Сачанкам, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Янкам Сіпаковым, пісьменнікам-франтавіком Алесем Савіцкім, легендарным скульптарам і архітэктарам Леанідам Левіным, кампазітарам Ігарам Лучанком, сынам Якуба Коласа — доктарам тэхнічных навук Міхасём Канстанцінавічам Міцкевічам і іншымі цікавымі суразмоўцамі, праз якіх аўтар «Трывожнай памяці» вымалёўвае партрэт блізкага і зразумелага яму часу.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**